МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

вул. Калектарная, 10, 220004, г. Мінск
Тэл./факс: 200-86-87, 200-97-55
E-mail: kanc@minjust.by, minjust@mailgov.by

МИНИСТЕРСТВО ЮСТИЦИИ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

ул. Коллекторная, 10, 220004, г. Минск
Тел./факс: 200-86-87, 200-97-55
E-mail: kanc@minjust.by, minjust@mailgov.by

29.07.2014 № 06-12/362

На № _____

Заснавальнікам Рэспубліканскага
праваабарончага грамадскага
аб'яднання «Рух за рэалізацыю
Міжнароднага пакта аб
грамадзянскіх і палітычных
правах «ПАКТ»
Пастухову М.І., Судаленка Л.Л.,
Букштынаву У.М. і інш.

Аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі
грамадскага аб'яднання

Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь разгледжаны дакументы аб дзяржаўнай рэгістрацыі Рэспубліканскага праваабарончага грамадскага аб'яднання «Рух за рэалізацыю Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах «ПАКТ» (далей – РПГА «ПАКТ»).

Умовы стварэння і дзейнасці грамадскага аб'яднання, парадак дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання і разгляду дакументаў, прадстаўляемых для яго дзяржаўнай рэгістрацыі, установлены артыкуламі 8, 13 і 14 Закону Рэспублікі Беларусь «Аб грамадскіх аб'яднаннях» (далей - Закон).

Артыкулам 13 Закону ўстаноўлены пералік дакументаў, якія прадстаўляюцца для дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання ў Міністэрства юстыцыі.

Згодна з абзацам шостым часткі шостай артыкула 13 Закону для дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання ў Міністэрства юстыцыі прадстаўляецца спіс заснавальнікаў грамадскага аб'яднання, у якім вызначаны прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку, дата нараджэння, грамадзянства, месца жыхарства і нумар дамашняга тэлефона, месца работы (навучання) і нумар рабочага тэлефона, а таксама змяшчаецца асабісты подпіс кожнага з заснавальнікаў.

Вывучэнне дакументаў, прадстаўленых для дзяржаўнай рэгістрацыі РПГА «ПАКТ», паказала, што ў спісе заснавальнікаў дадзенага грамадскага аб'яднання змешчаны не ўсе звесткі, устаноўленыя названым вышэй Законам.

Так, у спісе заснавальнікаў РПГА «ПАКТ» адсутнічаюць нумары рабочых тэлефонаў.

Пры правядзенні Міністэрствам юстыцыі выбарачнай праверкі звестак аб асобах, якія змешчаны ў спісе заснавальнікаў, вызначана, што заснавальнік РПГА «ПАКТ» ад Гомельскай вобласці Казлоў В.В. значыцца [redacted] года нараджэння, на самой справе нарадзіўся [redacted]

Кавалева Л.І. і Козяр Т.Ю. згодна вышэйназванага спіса зарэгістраваны па адрасу: [redacted] а на самой справе - [redacted]

Такім чынам, прадстаўлены ў Міністэрства юстыцыі спіс заснавальнікаў РПГА «ПАКТ» утрымлівае ў сабе няпэўныя звесткі.

У адпаведнасці з абзацам пятым часткі другой пункта 8 Інструкцыі аб парадку афармлення і разгляду дакументаў, звязаных з дзяржаўнай рэгістрацыяй, ліквідацыяй палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, іх саюзаў (асацыяцый), зацверджанай пастановай Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 30.08.2005 года № 48 (далей - Інструкцыя) у пратаколе ўстаноўчага схода павінны быць указаны прозвішча і ініцыялы ўсіх заснавальнікаў, якія прысутнічаюць на ўстаноўчым сходзе. Калі колькасць прысутных на ўстаноўчым сходзе болей 15 асоб, то да пратакола можа быць прыкладзены іх спіс з прастаўленнем у пратаколе адпаведнай адзнакі.

З прадстаўленага пратакола ўстаноўчага схода РПГА «ПАКТ» ад 07.06.2014 года бачыцца, што дадзены пратакол утрымлівае звесткі аб колькасці заснавальнікаў (52 асобы), якія прысутнічалі на ўстаноўчым сходзе, а таксама ўказваецца, што спіс заснавальнікаў прыкладваецца.

Разам з тым, спіс заснавальнікаў РПГА «ПАКТ» да пратаколу не прыкладзены.

Такім чынам, асобныя дакументы, прадстаўленыя ў Міністэрства юстыцыі для дзяржаўнай рэгістрацыі РПГА «ПАКТ», неадпавядаюць патрабаванням, прадугледжаным нормамі Закону і Інструкцыі, і з'яўляюцца несапраўднымі.

На падставе выкладзенага, кіруючыся абзацам трэцім часткі трэцяй артыкула 14 і абзацам чацвертым часткі трэцяй артыкула 15 Закону, рашэннем Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 25 ліпеня 2014 года ў дзяржаўнай рэгістрацыі РПГА «ПАКТ» адмоўлена.

Дадзенае рашэнне можа быць абскарджана ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь на працягу месяца з моманту яго атрымання.

Начальнік упраўлення па пытаннях некамерцыйных арганізацый **А.О.Кірычэнка**

96 Курилик